ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

***РЭЦЭНЗІІ***

***REVIEWS***

Паступіў у рэдакцыю 05.04.2023
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-3-263-264 Received 05.04.2023

**Г. В. Навасельцава**

*Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск, Беларусь*

# СПАЗНАЮЧЫ ЭПОХУ ХХ СТАГОДДЗЯ

Спазнаваць эпоху, ці, дакладней кажучы, мінулы час у яго грамадскім адлюстраванні, можна па дакументах або кнігах. Як вядома, дакументы патрабуюць уважлівага стаўлення і пэўнай дасведчанасці ў матэрыяле. Кнігі арыентуюць на творчае ўспрыманне, вобразнае асэнсаванне, некаторае супрацоўніцтва з аўтарам. Спазнаваць эпоху ХХ стагоддзя можна і праз творчасць выбраных пісьменнікаў, што пераканаўча даказвае цікавая і арыгінальная кніга М. У. Мікуліча «Краса, і праўда, і змаганне»[1] з прадмовай акадэміка НАН Беларусі У. В. Гніламедава. Выданне, дзе ўдала спалучаны творчы падыход да асэнсавання спадчыны адметных мастакоў слова з выкарыстаннем дакументальных матэрыялаў, прысвечана абмалёўцы літаратурных партрэтаў Казіміра Сваяка, Уладзіміра Жылкі, Міхася Васілька, Максіма Танка, Валянціна Таўлая, Міколы Арочкі, Ніла Гілевіча і іншых беларускіх паэтаў.

У кнізе змешчаны літаратурна-крытычныя артыкулы, у якіх паводле класічнай літаратуразнаўчай традыцыі раскрываецца жыццёвы і творчы шлях знакамітых асоб. Разам з тым для ўзнаўлення біяграфіі пісьменніка выкарыстоўваюцца архіўныя і эпісталярныя першакрыніцы, фрагменты гутарак аўтара з паэтамі, чалавечыя партрэты якіх часам могуць падавацца і ў святле асабістага знаёмства. У выніку цікаўныя чытачы змогуць даведацца шмат новага пра такіх знакамітых і, здавалася б, акадэмічна вывучаных класікаў айчыннага прыгожага пісьменства, як Максім Танк і Ніл Гілевіч. Будзе карысным для шырокага кола чытачоў, у тым ліку студэнтаў-філолагаў, аналіз жыццёвага і творчага шляху, напрыклад, Уладзіміра Жылкі, Міхася Машары, Валянціна Таўлая. Застаецца актуальнай патрэба ў поўных, вычарпальных звестках (і паслядоўна прадстаўленых у кнізе «Краса, і праўда, і змаганне») пра гэтыя творчыя персаналіі, якія вывучаюцца ва ўніверсітэцкім курсе гісторыі беларускай літаратуры. Сапраўдных знаўцаў роднай паэзіі, несумненна, зацікавяць артыкулы, прысвечаныя такім малавядомым творцам, як Пётра Сяўрук, Аўген Бартуль, Анатоль Іверс, спадчына якіх яшчэ патрабуе свайго вывучэння і настойлівай папулярызацыі, чаму і будзе спрыяць гэтае выданне. Дарэчы, усе змешчаныя ў кнізе артыкулы пачынаюцца з лёгкіх для ўспрымання і запамінання вершаваных радкоў, якія з’яўляюцца, кажучы сучаснай мовай, «візітоўкай» творчай асобы. І гэта таксама будзе садзейнічаць распаўсюджванню айчыннай літаратуры ў сучасным інфармацыйным грамадстве.

Як пра баладу высокага таленту распавядае аўтар «Красы, і праўды, і змагання» пра творчую спадчыну класіка нашай літаратуры – Максіма Танка, з якім ён падтрымліваў блізкія сяброўскія адносіны. Згадваючы пра 110-годдзе з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта, М. Мікуліч разам з тым адзначае, што Яўген Іванавіч Скурко быў вельмі сціплым, мяккім чалавекам, ён хацеў перапісаць сваю вядомую паэму «Нарач», паколькі, насуперак меркаванням крытыкаў і літаратуразнаўцаў, лічыў яе няўдалай, слабай, перапрацаваць многія свае вершы, у якіх бачыў недахопы. Ва ўяўленні сучаснага чытача ствараецца партрэт надзвычай строгага і патрабавальнага да сябе чалавека: ён адмаўляўся ад высокіх пасад, таму што хацеў засяродзіцца на творчай працы, у якой знаходзіў вялікае маральнае задавальненне. А займаючы пасаду галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», Максім Танк заўсёды выкрэсліваў сваё імя з тых літаратурна-крытычных матэрыялаў, дзе выказваліся ўхвальныя ацэнкі аўтарам асобы Танка, дбаў такім чынам пра этыку чалавечых узаемаадносін... Творца саромеўся насіць свае дзяржаўныя ўзнагароды, якіх меў даволі шмат...

Усе гэтыя звесткі падрыхтоўваюць чытача да ўспрымання сур’ёзных высноў, якія датычацца духоўна-мастацкага вобліку паэзіі Максіма Танка. У артыкуле адзначаюцца і на канкрэтных прыкладах даказваюцца экспрэсіўнасць светаадчування паэта, эмацыянальна-пачуццёвая ўсхваляванасць, рамантызаванае выяўленне суровага рэалізму часу. У выніку нельга не пагадзіцца з тым, што «паэзія М. Танка была звернута да выяўлення аўтаноміі суб’ектыўнай аўтарскай здольнасці і мастацкага інтэлекту, свабоды і нязмушанасці творчага дыскурсу. Яна раскрывала напружаную працу шчырай, сумленнай, таленавітай асобы, ідэйна-эстэтычную энергію духу, якія вызначаліся актыўным рухам уяўлення і фантазіі» (с. 250). Так, скразнымі для творчасці класіка айчыннай літаратуры сталіся вобразы Радзімы, народа, Нарачанскага краю, маці, хлеба, песні, з якімі ў свядомасці сярэднестатыстычнага чытача і асацыіруецца яго спадчына. Словам, пададзены шматаспектны аналіз жыцця і творчай дзейнасці знакамітага паэта, які значны яшчэ і тым, што ніжэй акрэслены яго паплечнікі, найбольш таленавітыя вучні. Да ліку апошніх аднесена, у прыватнасці, не менш цікавая асоба ў айчынным прыгожым пісьменстве – Ніл Сымонавіч Гілевіч. У артыкуле «Мы ўзышлі не з на-

© Навасельцава Г. В., 2025

[1] Мікуліч, М. У. Краса, і праўда, і змаганне : літаратурна-крытычныя артыкулы / М. У. Мікуліч. – Мінск : Беларус. навука, 2022. – 403 с.

сення, што ветрам занесена...» падаюцца падрабязнасці асабістых сустрэч і змястоўных размоў аўтара кнігі з «вялікім патрыётам беларускай зямлі, выдатным паэтам, перакладчыкам і вучоным, чалавекам вялікага, нераўнадушнага сэрца, да канца верным свайму высокаму духоўна-маральнаму і грамадзянска-патрыятычнаму абавязку» (с. 402).

У кнізе М. Мікуліча канцэптуальна асэнсоўваецца творчая пераемнасць у айчыннай літаратуры. Так, у артыкуле «Сваё жыццё паклаў на шалі...» пацвярджаецца агульнапрынятае меркаванне, што Уладзімір Жылка развіваў эстэтычныя традыцыі Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, што менавіта да гэтых вялікіх пісьменнікаў і быў блізкі сваім мастацкім мысленнем. Разам з тым невыпадкова заўважаецца, што многія вершы У. Жылкі маюць выразны *баладны характар* (курсіў наш. – *Г. Н.*), у якіх паэт разважае над жыццёвай доляй і чалавечым лёсам, выяўляе высокі лірычны пафас... Пасля пераезду з Прагі ў Мінск і выдання зборніка «З палёў Заходняй Беларусі» цяжка хворы паэт быў падвергнуты тэндэнцыйнай і несправядлівай крытыцы з боку шматлікіх прыхільнікаў класава-пралетарскіх прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці. У артыкуле дэталізуецца гэта сітуацыя праз аналіз крытычных выступленняў у перыядычным друку, што з нагляднасцю раскрывае грамадскі змест таго гістарычнага часу.

Выступае паказальнай для свайго часу і асяроддзя творчая персаналія Міхася Машары (артыкул «З сяўнёю, поўнаю зярнят...»). Пра гэта сведчыць хоць бы тое, што ў перадваеннае дзесяцігоддзе пісьменнік становіцца адным з самых вядомых у грамадска-культурным асяроддзі Вільні, адным з самых папулярных сярод масавага чытача Заходняй Беларусі. Яго творы вымушалі «задумацца над сваім жыццём і яго акалічнасцямі, цвяроза і ўзважна асэнсаваць рэальны стан грамадскіх з'яў і працэсаў» (с. 91). Гэтыя звесткі дапамагаюць асэнсаванню лірычнага героя Міхася Машары, чалавека шчырага, сумленнага і даверлівага, менавіта паводле гэтых рысаў і вядомага сучаснаму чытачу. Успрыманне непасрэдна асобы паэта паглыбляецца дзякуючы пададзеным у артыкуле крытычным водгукам, напісаным, напрыклад, маладым Максімам Танкам. Удакладняецца, што на гэтыя крытычныя выступленні Міхась Машара адгукнуўся ў друку «падкрэслена нязгодлівым вершам», што дазваляе пабачыць спецыфіку тагачаснага літаратурнага працэсу. Лаканічна, але змястоўна аналізуюцца і раманы-хронікі М. Машары, напісаныя ўжо ў 1960–1970-я гг., якія застаюцца маладаследаванай старонкай у айчыннай прозе.

У артыкуле «Пілую вершам краты...» асэнсоўваецца творчы феномен Валянціна Таўлая, які друкаваўся вельмі мала, але стаў адным з самых «адметных, яркіх і крэатыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага падполля і літаратурнага працэсу ў Заходняй Беларусі» (с. 279). Гэтая творчая асоба ўражвае найперш сваёй незвычайнай біяграфіяй: удзел у заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым руху, камуністычным падполлі, а падчас Вялікай Айчыннай вайны В. Таўлай быў сувязным партызанскага атрада, выконваў спецыяльныя заданні разведкі. Невыпадкова, што значнае месца ў яго паэзіі «належала вершу-маніфесту, вершу-гімну, вершу-патрабаванню, якія звярталі на сябе ўвагу падкрэсленай унутранай сабранасцю зместу, ёмістай і дынамічнай формай, выразнай і суровай меладычнай інструментоўкай» (с. 289). Дарэчы, цытуецца напісаны паэтам матэрыял «Літаратура Заходняй Беларусі», дзе Валянцін Таўлай акрэслівае таксама і функцыянальную ролю твораў прыгожага пісьменства. Паэт метафарычна выказваецца ў тым плане, што верш павінен дзейнічаць, і трапна параўноўвае яго з вострым стрэлам, які дасягае сваёй мэты.

Пётр Сяўрук (артыкул «Не здраджай сабе самому...») быў вядомы ў другой палове 1920-х гг. на Скідзельшчыне. Аўтар апавяданняў, аповесцей, вершаў, дзённікаў, нататак, публіцыстычных і філасофскіх матэрыялаў, актыўны ўдзельнік Таварыства беларускай школы... Цікава, што яго творы не друкаваліся пры жыцці, а дайшлі да нас у рукапісах. У тых вершах мы не знойдзем «традыцыйнага для беларускай літаратуры адлюстравання рэчаіснасці, падзей і фактаў знешняга свету, выяўлення рамантычна-ўзвышаных заклікаў і парыванняў лірычнага героя» (с. 117). Паэзія Пятра Сеўрука звернута да асэнсавання экзістэнцыяльных асноў быцця, да пазнання духоўнай сутнасці асобы.

Сімпатызаваў партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя Аўген Бартуль (артыкул «Поўны мы жыццёвай прагі...»), які выступаў за незалежнае развіццё Беларусі. Адзін з самых папулярных заходнебеларускіх паэтаў у канцы 1920 – пачатку 1930-х гг., пра якога пісалі «не толькі беларускія, але і літоўскія, украінскія, польскія выданні, яго адзначалі як цікавага, арыгінальнага беларускага паэта аўтарытэтныя літаратары, публіцысты, даследчыкі прыгожага пісьменства» (с. 156). Амаль невядомыя сёння вершы Аўгена Бартуля прасякнуты рамантычным гістарызмам, маляўнічай пейзажнасцю, паэтам створаны рамантычна-ідэалізаваны вобраз роднага краю. Жыццёвы шлях самога пісьменніка – гэта відавочнае сведчанне таго, якой слабай і безабароннай можа аказацца асоба перад драматычна-трагічнымі перыпетыямі віхурнага ХХ стагоддзя. Лёс складаўся такім чынам, што надалей творца мог працаваць (пад псеўданімам Бужанскі) найперш як крытык і публіцыст. У выніку з'явіліся грунтоўныя матэрыялы, прысвечаныя М. Машару, М. Танку, М. Васільку і іншым, здабыткі заходнебеларускай паэзіі разглядаліся ў агульнаеўрапейскім кантэксце, і, напэўна, у гэтым і заключаецца важкі ўнёсак Аўгена Бартуля ў развіццё айчыннай культуры.

Такім чынам, кніга М. У. Мікуліча «Краса, і праўда, і змаганне» – глыбокае, грунтоўнае выданне, дзе паслядоўна раскрываюцца вядомыя і менш вядомыя, але ў любым выпадку значныя персаналіі заходнебеларускай літаратуры, паглыбляюцца агульнапрынятыя ўяўленні аб прыгожым пісьменстве гэтага часу. Кнігу варта прачытаць дзеля больш цэласнага ўспрымання, напрыклад, творчай спадчыны такіх асоб, як Казімір Сваяк, Міхась Васілёк, Ніна Тарас... І ў выніку пераканацца, што заходнебеларускіх паэтаў яднае і складаны, пакручасты, выпрабавальны жыццёвы шлях, і палымянае творчае гарэнне, і высокая адданасць роднаму слову, і ўсведамленне сваёй літаратурнай місіі. Мабыць, менавіта таму вершы, напісаныя ў такіх умовах выключнымі людзьмі, гучаць шчыра і ўзнёсла. Сапраўды па-баладнаму...

**Информация об авторе**

**Новосельцева Анна Викторовна** – кандидат филологических наук, доцент кафедры литературы. Витебский государственный университет имени П. М. Машерова (пр. Московский, 33, 210038, Витебск, Республика Беларусь). E-mail: novoseltseva.anna@mail.ru

**Information about the author**

**Anna V. Novoseltseva** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor at the Department of Literature. P. M. Masherov Vitebsk State University (33 Moskovskiy Ave., Vitebsk 210038, Belarus). E-mail: novoseltseva.anna@mail.ru